# ФУНКЦЫЯНЕР І КРАЯЗНАВЕЦ. УДЗЕЛ ДАЦЭНТА БДУ А. А. СЯНКЕВІЧА Ў КРАЯЗНАЎЧЫМ РУХУ БССР У 1920–1930-я гг.

**А. У. Дзянісаў**

*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 65, 220013, г. Мінск, Беларусь, dzianisau.1982@gmail.com*

У артыкуле на аснове архіўных крыніц паказаны ўдзел дацэнта БДУ А. А. Сянкевіча ў краязнаўчым руху ў 1920-я гг. Ён з'яўляўся ўдзельнікам некалькіх краязнўчых арганізацый, дэлегатам важных краязнаўчых канферэнцый і з'ездаў, сумяшчаў кіраўнічую з навукова-даследчай дзейнасцю. А. А. Сянкевіч не толькі зрабіў уклад у разгортванне краязнаўчага руху ў 1920-я гг., але і ўскосна прычыніўся да ліквідацыі краязнаўчых арганізацый у другой палове 1930-х гг.

***Ключавыя словы:*** краязнўчы рух; культурнае будаўніутва; навукова-даследчая дзейнасць; БДУ; краязнаўчыя канферэнцыі.

# ФУНКЦИОНЕР И КРАЕВЕД. УЧАСТИЕ ДОЦЕНТА БГУ А. А. СЕНКЕВИЧА В КРАЕВЕДЧЕСКОМ ДВИЖЕНИИ В 1920–1930-е гг.

**А. В. Денисов**

*Белоруссиий национальный технический университет,*
*пр. Независимости, 65, 220013, г. Минск, Беларусь, dzianisau.1982@gmail.com*

В статье на основе архивных источников показано участие доцента БГУ А. А. Сенкевича в краеведческом движении в 1920-е гг. Он являлся членом нескольких краеведческих организаций, делегатом ключевых краеведческих конференций и съездов, совмещал управленческие должности с научно-исследовательской деятельностью. А. А. Сенкевич не только внес вклад в развитие массового краеведческого движения в БССР, но и имел косвенное отношение к ликвидации краеведческих организаций в другой половине 1930-х гг.

***Ключевые слова:*** краеведческое движение; культурное строительство; научно-исследовательская деятельность, БГУ, краеведческие конференции.

# POLITICAL OFFICIAL AND LOCAL HISTORIAN. THE PARTICIPATION OF ASSOCIATE PROFESSOR OF BSU A.A. SIANKEVICH IN THE LOCAL STUDY MOVEMENT OF THE BSSR IN THE 1920's–1930's

**A. U. Dzianisau**

*Belarussian national technical university,*
*Nezavisimosty Ave., 65, 220013, Minsk, Republic of Belarus, dzianisau.1982@gmail.com*

The article, based on archival sources, shows the participation of BSU associate professor A. A. Sienkevich in the local history movement in the 1920's. He was a member of several local history organizations, a delegate to important local history conferences and congresses,

combined managerial with research activities. A. A. Sienkevich not only contributed to the development of the local history movement in the 1920's, but also indirectly contributed to the liquidation of local history organizations in the second half of the 1930's.

***Keywords:*** local history; local studies movement; cultural construction; research activity; BSU; local history conferences.

У 1920-я гг. ў Савецкай Беларусі шпаркімі тэмпамі разгортваўся краязнаўчы рух. У пачатку 1930 г. краязнаўчая праца выйшла на першае месца ў Савецкім Саюзе па многіх паказчыках: колькасць добраахвотных краязнаўчых таварыстваў і гурткоў дасягала лічбы 330, а агульная колькасць членаў гэтых таварыстваў складала каля 10 000 чалавек. Удзельнікамі краязнаўчых таварыстваў і гурткоў былі як вядомыя навукоўцы, так і шараговыя працаўнікі асветы, тэхнічная інтэлегенцыя і вучнёўская моладзь.

Асобную групу ўдзельнікаў складалі прадстаўнікі ўлады: партыйныя функцыянеры, палітычныя дзеячы, члены апарата ЦК КП(б) Беларусі. Іх задачай была падтрымка нізавых ініцыятыў, накіроўванне працы грамадскіх арганізацый ў карысным для дзяржавы накірунку, нагляд і кантроль беларускай інтэлегенцыі. Часта яны сумяшчалі палітычную, навуковую і творчую працу. У склад гэтай групы ўваходзіў партыйны і палітычны дзеяч Аляксандр Антонавіч Сянкевіч, які стаў важнай асобай у сацыяльна-палітычным, навуковым і культурным жыцці Савецкай Беларусі на працягу 20–30-х гг. ХХ ст.

Жыццю і дзейнасці А. А. Сянкевіча прысвечана некалькі матэр’ялаў, у прыватнасці артыкулы А. Камароўскага і С. Гамолкі, дзе прыводзяцца цікавыя факты яго біяграфіі [6; 3]. Разам з тым абодва артыкулы не ўтрымліваюць спасылак на архіўныя сінхронныя крыніцы.

Нарадзіўся А. А. Сянкевіч 20 студзеня 1884 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна. У 1902 г. скончыў нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, працаваў настаўнікам. У 1905–1906 гг. удзельнічаў у рэвалюцыйным руху, стаяў на сацыялістычных пазіцыях. А. А. Сянкевіч быў адным з арганізатараў нелегальнага з’езду беларускіх настаўнікаў, які адбыўся 9 ліпеня 1906 г. недалёка ад сяла Мікалаеўшчына Свержанскага павета Мінскай губерні (суч. Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці). У працы з’езда прымалі ўдзел К. М. Міцкеіч (Я. Колас), І. М. Федараў (Я. Маўр), І. Н. Лапцэвіч, С. Ф. Самахвал і інш. А. А. Сянкевіч быў абраны старшынёй з’езда. Пасля ўдзельнікі з’езда былі арыштаваныя царскімі ўладамі.

Затым А. А. Сянкевіч эміграваў у Паўночную Амерыку, дзе ўдзельнічаў у палітычным і прафсаюзным руху, наладжваў сувязі з камуністычнымі сіламі. У 1913 г. скончыў медыцынскі факультэт Мэрылэндскага ўніверсітэта ў Коледж-Парку (University of Maryland, College Park) у Балтыморы. У 1916 г. вёў медыцынскую практыку на Алясцы.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. А. А. Сянкевіч, як і іншыя палітычныя эмігранты, вырашыў вярнуцца на тэрыторыю былой Расійскай Імперыі праз Далёкі Ўсход разам з А. М. Краснашчокавым. Ён прымаў удзел у партызанскім руху, займаўся прафсаюзнай і партыйнай працай, займаў пасаду намесніка міністра народнай асветы ва ўрадзе Дальняўсходняй рэпублікі.

Пасля ліквідацыі Дальняўсходняй рэспублікі ў 1921 г. А. А. Сянкевіч пераехаў у БССР, дзе пабудаваў бліскучую кар'еру. Ён заняў пасаду Народнага камісара па справах аховы здароўя, у 1922 г. узначаліў агітацыйна-прапагандысцкі аддзел акруговага партыйнага камітэта ў Віцебску. У 1923 г. стаў рэдактарам літаратурнага часопіса «Полымя».

У гэты перыяд у Савецкай Беларусі шпаркімі тэмпамі адбывалася дзяржаўнае, эканамічнае і навукова-культурнае будаўніцтва, якое выклікала вялікі энтузіязм у грамадстве. Узніклі шматлікія добраахвотныя грамадскія таварыствы і арганізацыі, у тым ліку і краязнаўчыя. У 1921–1923 гг. цэнтрам краязнаўчай працы зрабіўся Мінск, дзе дзейнічала таварыства гісторыі і старажытнасцяў. Яго членамі былі такія вібітныя навукоўцы як У. І. Пічэта, Ф. Ф. Турук, Я. Ф. Карскі, М. А. Янчук. Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў займалася гістарычнымі і этнаграфічнымі даследваннямі, праводзіла навукова-даследчыя экспедыцыі і наладжвала сувязі з краязнаўчымі таварыствамі БССР [12, л. 1–6].

Важнасць краязнаўчай справы пачалі разумець улады. Загадам Народнага камісарыята асветы ад 28 сакавіка 1924 г. за № 41 пры Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульт) было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК). У яго склад увайшлі У. І. Пічэта (першы старшыня), А. А. Смоліч, С. В. Скандракоў (сакратар), М. В. Азбукін, В. Д. Дружчыц, прадстаўнікі ад Агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦК КП(б) Беларусі (АПА), ад ЦК КСМБ, Галоўнага ўпраўлення палітыка-асветнай работы, Галоўнага ўпраўлення сацыяльнага выхавання і Саюза прадстаўнікоў асветы і інш. [24, л. 6]. Асноўнымі задачамі ЦБК лічыліся арганізацыя краязнаўчых таварыстваў і агульнае кіраванне іх дзейнасцю, арганізацыя ўсебеларускіх канферэнцый па краязнаўстве, збор экспанатаў праз таварыствы краязнаўства і размеркаванне іх па музеях, аддзелах і секцыях Інбелкульта, выданне прац, праграм і анкет па краязнаўстве. Гэта дало імпульс да развіцця краязнаўчай працы [25, л. 126].

У Віцебску А. А. Сянкевіч праявіў цікавасць да краязнаўчай справы, пазнаёміўшыся з М. І. Каспяровічам, удзельнікам Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў, актыўным удзельнікам краязнаўчага руху. У канцы 1923 г. у Віцебску пачалася праца па арганізацыі таварыства краязнаўства пры губернскім, а пазней акруговым аддзеле народнай асветы, якое ўзначаліў М. І. Каспяровіч [1, с. 3]. Таварыства мела падзел

на секцыі: прыродазнаўча-геаграфічная, эканамічная, этнаграфічная і культурна-гістарычная. Часовым праўленнем быў створаны план працы, галоўнымі пунктамі якога былі навукова-даследчая, выдавецкая дзейнасць і папулярызацыя ідэй краязнаўства. Статут таварыства быў прадстаўлены на зацвярджэнне ў Прэзідыўм губернскага выканаўчага камітэту праз губернскі аддзел, а пазней у прэзідыум павятова-гарадскога выканаўчага камітэта праз павятовы аддзел народнае асветы [10, с. 3]. Аднак у зацвярджэнні на той момант было адмоўлена, у адпаведнасці з пастановамі СНК РСФСР аб тэрміне рэгістрацыі навуковых таварыстваў, дзейнасць Віцебскага таварыства была прыпынена [7, с. 36].

У сакавіку 1924 г. Віцебская губерня ўвайшла ў склад БССР. З гэтага часу патрэба ў комплексным даследаванні края для дзяржаўнага і эканамічнага будаўніцтва стала відавочнай. Статут Віцебскага краязнаўчага таварыства быў зацверджаны 3 верасня 1924 г., яно атрымала легальны статус і магчымасць для працы. У лістападзе 1924 г. на трэцім пасяджэнні таварыства было абрана праўленне, у склад якога ўвайшлі М. І. Каспяровіч, А. А. Сянкевіч і інш. Былі сфарміраваны 2 камісіі: рэвізійная і бібліяграфічная, задача апошняй была ў складанні бібліяграфіі па Віцебшчыне [11, с. 3]. А. А. Сянкевіч разам з іншымі краязнаўцамі прыняў удзел у Першай Усебеларускай краязнаўчай канфереэнцыі (рыс. 1).



*Рыс. 1.* Члены *Віцебскага* краязнаўчага таварыства, 1924.
А. А. Сянкевіч (другі злева ў ніжнім шэрагу) і М. І. Каспяровіч (трэці злева)

Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя прайшла з 29 лістапада па 1 снежня 1924 г. У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі усіх краязнаўчых арганізацый Савецкай Беларусі. Ад імя Інбелкульта на адкрыцці канферэнцыі выступіў вучоны сакратар Я. Л. Дыла. У прэзыдыўм канферэнцыі увайшлі А. А. Сянкевіч, А. А. Смоліч, А. І. Ажгірэй (А. Вольны). Сакратаром канферэнцыі стаў М. І. Каспяровіч.

Акрамя гэтага ў канферэнцыі ўдзельнічалі прафесар І. І. Замоцін, даследчык батанікі У. У. Адамаў, работнік Цэнтрархіва БССР М. В. Мялешка, К. К. Атраховіч (К. Крапіва), прафесар А. М. Грыгор'еў, прафесар Б. К. Тарлецкі, прафесар С. У. Скандракоў, А. А. Самцэвіч і інш. Колькасць удзельнікаў склала каля 40 асобаў [23, с. 168].

А. А. Сянкевіч уваходзіў у прэзідыўм канферэнцыі, у сваіх прамовах ён падкрэсліваў вялікае значэнне краязнаўчай справы для камуністычнай партыі Беларусі і заклікаў усіх членаў краязнаўчых таварыстваў і прадстаўнікоў іншых арганізацый рашуча ўзяцца за краязнаўчую працу, каб паспрыяць узмацненню эканомікі і культуры БССР.

Па выніках канферэнцыі А. А. Сянкевіч быў абраны адным з дэлегатаў на Усесаюзны краязнаўчы з'езд у Маскве. Пасля гэтага ён застаўся на працы у РСФСР, заняўшы пасаду загадчыка беларускага сектара Камуністычнага ўніверсітэта нацыянальных меншасцяў Захаду, на якой працаваў да пачатку 1926 г. За гэты час большасць пастаноў Першай Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі была рэалізавана, па ўсёй тэрыторыі БССР узніклі новыя краязнаўчыя таварыствы, адбылося фарміраванне сістэмы арганізацыі і кіравання краязнаўчай працай [20, с. 170–171].

ЦБК пры Інбелкульце праводзіла актыўную дзейнасць, ажыцяўляла меры па наладжванню сувязяў з існуючымі краязнаўчымі таварыствамі, стымулявала ўзнікненне новых, накіроўвала іх дзейнасць і распаўсюджвала метадычную літаратуру. У 1925 г. было распачата выданне спецыялізаванага краязнаўчага часопіса «Наш край», дзе змяшчаліся вынікі краязнаўчых даследванняў і метадычныя інструкцыі. У першым нумары часопіса быў надрукаваны артыкул А. А. Сянкевіча, прысвечаны тэме аграрнага руху на Міншчыне ў 1905–1906 гг. [21].

Асноўным відам працы краязнаўчых таварыстваў з'яўлялася навуковае апісанне тэрыторыі. Гэтыя працы павінны былі скласці адзіны комплексны калектыўны твор усёй краязнаўчай сеткі — краязнаўчае апісанне БССР. Усім краязнаўчым арганізацыям было прадпісана прымаць актыўны ўдзел у працы Інстытута беларускай культуры і яго секцый шляхам збірання навуковых матэрыялаў па існуючых інстукцыях, пасылаючы матэрыялы ў аддзелы і камісіі праз ЦБК. Асаблівая ўвага надавалася матэрыялам па народнай мове і фальклору. Усё гэта выклікала патрэбу правесці яшчэ адну вялікую краязнаўчую канферэнцыю, якая была пазней названа Першым Усебеларускім краязнаўчым з'ездам [4, с. 5].

Першы Усебеларускі краязнаўчы з’езд адбыўся з 7 па 10 лютага 1926 г. у памяшканні Інбелкульта, дзе былі абмеркаваны асноўныя накірункі дзейнасці краязнаўчых арганізацый, быў агучаны агульны лік членаў краязнаўчых таварыстваў — 5000 чалавек і рух працягваў павялічвацца. У асноўнай рэзалюцыі з’езду краязнаўчым арганізацыям прапанавалася пачаць больш інтэнсіўную дзейнасць па ўцягванню ў краязнаўчую працу шырокіх працоўных мас, прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў, чые нацыянальныя аддзелы дзейнічалі пры Інбелкульце. Вялікая ўвага павінна была надавацца краязнаўчаму ўхілу школ і ўвязванню іх дзейнасці па вывучэнню края з дзейнасцю краязнаўчых і гаспадарчых арганізацый [16, с. 5].

У працы з’езду прынялі ўдзел 143 дэлегаты: прадстаўнікі ад камісій Інбелкульта, ЦБК і музеяў, краязнаўчых таварыстваў і гурткоў. У спісе дэлегатаў запісана прозвішча «А. Сянкевіч», які прадстаўляў на зъездзе полацкіх краязнаўцаў [19, с. 78]. Магчыма А. А. Сянкевіч перад пераездам з Масквы ў Мінск выконваў працу ў полацкай акрузе.



*Рыс. 2.* Члены праўлення і рэвізійнай камісіі навукова-даследчага краязнаўчага таварыства БДУ, 1927 г. У сярэднім шэрагу злева направа: кіраўнік яўрэйскага сектара ЦБК Г. С. Аляксандраў, дацэнт І. М. Пшанічны, прафесар В. Д. Дружчыц, старшыня таварыства прафесар У. І. Пічэта, дацэнт А. А. Сянкевіч, намеснік старшыні ЦБК А. З. Казак

У 1926–1928 гг. А. А. Сянкевіч з’яўляўся дацэнтам БДУ, займаў пасаду загадчыка кафедры гісторыі партыі і ленінізму на факультэце Права і гаспадаркі [14, л. 28]. У гэты час ён быў адным з актыўных удзельнікаў навукова-даследчага краязнаўчага таварыства БДУ (рыс. 2). У фондзе БДУ Нацыянальнага архіва рэспублікі Беларусь пратаколы пачатку працы

таварыства датаваны 1928 г., аднак гэта выклікана канчатковым афармленнем сістэмы кіравання краязнаўчым рухам і ўніфікацыяй дакументаў краязнаўчых таварыстваў усіх узроўняў, якія былі распрацаваны ЦБК у канцы 1927 г. [15, л. 3–16].

Краязнаўчае навукова-даследчае таварыства БДУ пачало сваю дзейнасць у 1925 г. у выніку аб'яднання некалькіх краязнаўчых студэнцкіх гурткоў. На першым этапе таварыства сутыкнулася з шэрагам цяжкасцяў: адсутнасцю матэрыяльнай базы, сродкаў на экспедыцыі, экскурсіі і метадычную літаратуру, а таксама няўвязка працы таварыства з вучэбнымі планамі [9, с. 111]. Канчатковае фарміраванне секцый і працы адбылося на працягу 1926–1927 гг. Таварыства БДУ паставіла перад сабой наступныя задачы: аб'яднанне акадэмічных сіл і студэнцкіх гурткоў вакол навукова-даследчай працы, падрыхтоўка студэнтаў-краязнаўцаў, усебаковае вывучэнне краіны праз збіранне краязнаўчага матэрыялу як асобнымі членамі, так і шляхам экспедыцый, навукова-даследчая апрацоўка сабраных матэрыялаў, публікацыя вынікаў працы у навуковых і папулярных выданнях. Найбольш актыўны перыяд працы краязнаўчага таварыства БДУ адбываўся у летні перыяд [17, с. 27].

Працай таварыства кіравала праўленне з 12 асобаў, сярод якіх былі прафесары У. І. Пічэта (старшыня), В. Д. Друшчыц, М. Ф. Бліодухо, дацэнт А. А. Сянкевіч, студэнты І. Н. Марук, М. М. Улашчык, А. Г. Аніхоўскі і інш. [8, с. 85–88].

Дацэнт А. А. Сянкевіч на працягу 1926–1927 гг. выконваў абавязкі намесніка старшыні таварыства, узначальваў сацыяльна-эканамічную секцыю, якая мела две камісіі: прававую і эканамічную, выступаў з дакладамі, прымаў удзел у шэрагу навукова-даследчых экспедыцый. Акрамя гэтага ен падтрымліваў цесныя сувязі з Центральным бюро краязнаўства, выступаў на яго пасяджэннях. У спісе дэлегатаў Другога Усебеларускага краязнаўчага з'езда А. А. Сянкевіч быў пазначаны ў спісах як прадстаўнік не навукова-даследчага таварыства БДУ, а ЦБК [18, с. 122].

Другі Усебеларускі з'езд адбыўся 10–13 лютага 1927 г. У яго рабоце прыняла ўдзел 180 дэлегатаў ад краязнаўчых таварыстваў і гурткоў Савецкай Беларусі. З'езд адзначыў, што краязнаўчы рух развіваецца ў належным кірунку [18, с. 6–8]. На ім была канчаткова аформлена структура краязнаўчай сеткі: нізавы гурток, які вывучае частку раёну, раённае таварыства краязнаўства, акруговае таварыства краязнаўства [18, с. 123–125]. Праца Другога Усебеларускага з'езда праводзілася па 4 секцыях: прырода-геаграфічнай, культурна-гістарычнай, школьна-краязнаўчай і яўрэйскай. З'езд прыняў рэзалюцыю, асноўныя пункты якой былі накіраваны на развіццё ўжо дасягнутых вынікаў, паглыбленне краязнаўчай працы, наданне ёй большай масавасці і пераадоленне недахопаў.

На з'ездзе быў сфарміраваны новы склад ЦБК: М. І. Бялуга (старшыня), А. З. Казак (намеснік), М. І. Каспяровіч (навуковы сакратар), 2 агульных інструктары К. К. Астраховіч (К. Крапіва) і А. А. Шашалевіч і 2 інструктары нацменшасцяў — Г. С. Аляксандраў (яўрэйскі сектар) і К. А. Дамброўскі (польскі сектар) [5, с. 61].

У 1928 г. А. А. Сянкевіч стаў рэктарам Беларускага Камуністычнага універсітэта імя Леніна, з 1929 г. — загадчыкам аддзела друку, культуры і прапаганды ЦК КП(б) Беларусі. У 1931–1932 г. працаваў у Інстытуце літаратуры і мастацтва Беларускай акадэміі навук (па іншых звестках — узначальваў установу).

У сярэдзіне 1930 г. у БССР была разгорнута барацьба з нацыянал-дэмакратызмам, па абвінавачванням у шкодніцкай і антысавецкай дзейнасці былі арыштаваны і асуджаны многія дзеячы навукі і культуры БССР, ў тым ліку і тыя, з якімі супрацоўнічаў А. А. Сянкевіч па краязнаўчай справе: М. І. Каспяровіч, М. В. Азбукін, А. А. Смоліч, М. М. Шчакаціхін, С. М. Мялешка і інш. Быў арыштаваны і прафесар У. І. Пічэта, які нядоўгі час ўзначаліваў ЦБК і з'яўляўся старышнёй навукова-даследчага краязнаўчага таварыства БДУ.

«Чыстку» краязнаўчага руху, пераарыентацыю сеткі краязнаўчых арганізацый на пралетарскія рэйкі ў 1930–1931 гг. суправаджала крытыка ранейшых дасягненняў краязнаўцаў ў прэсе і на старонках асобных выданняў. А. А. Сянкевіч у гэты перыяд выдаў брашуру «За ленінскую лінію ў нацыянальнай палітыцы», дзе таксама аблічаў нацыянал-дэмакратаў, шавіністаў і іншых ворагаў пралетарскай беларускай культуры. Аднак краязнаўства ім не было закранута, у асноўным пад агонь яго крытыкі трапілі літаратурныя колы [22].

У сярэдзіне 1930-х А. А. Сянкевіч ізноў пераехаў у Маскву. Там ён працаваў дырэктарам Інстытута гігіены і санітарыі Народнага камісарыята аховы здароўя РСФСР (1932), загадчыкам сектара Міжнароднай ленінскай школы (1933), старшынёй аддзела падрыхтоўкі кадраў ва Усесаюзным радыёкамітэце (1935–1937). Іншыя задачы прымусілі яго аддаліцца ад краязнаўчай справы.

У канцы 1930-х гг. А. А. Сянкевіч, як і шмат іншых работнікаў апарата ЦК КП(б) Беларусі, патрапаіў пад палітычныя рэпрэсіі. У 1937 г. ён быў выключаны з шэрагаў партыі, а ў студзені 1938 г. арыштаваны і этапаваны ў Мінск [2, с. 96].

У партыйным фондзе НАРБ захаваўся пратакол яго допыту ад 10 лютага 1938 г. У ім А. А. Сянкевіч прызнаўся ў прыналежнасці да антысавецкай, нацыянал-фашысцкай арганізацыі, у якую быў завербаваны ў 1925 г. у Маскве разам М. Чаротам, У. М. Ігнатоўскім і А. І. Хацкевічам. Ён даў

паказанні на вядомых дзеячоў беларускай дзяржавы, сярод якіх былі А. Р. Чарвякоў, М. М. Галадзед, Я. П. Адамовіч, А. Ф. Адамовіч, А. Ф. Ульянаў і інш. У прыналежнасці да нацыянал-фашысцкай арганізацыі, трацкістскага цэнтру ім былі дадзены паказанні на літаратараў і навукоўцаў А. І. Аляксандровіча, А. Вольнага, П. Р. Галавача, М. Чарота, М. Зарэцкага, гісторыка М. Д. Дружчыца, прэзідэнта Акадэміі Навук БССР П. В. Горына (Каляду), рэктара БДУ Я. П. Каранеўскага, сакратара Акадэміі наук БССР П. Я. Панкевіча і інш. [12, л. 5–12].

Акрамя гэтага А. А. Сянкевіч даў паказанні супраць двух дзеячоў краязнаўчага руху: М. І. Бялугі, які з'яўляўся стрышынёй ЦБК у 1926–1929 гг. і займаў пасаду віцэ-прэзідэнта Акадэміі Навук БССР і А. З. Казака, які выконваў абавязкі намесніка старшыні (1926–1929) і старшыні ЦБК (1929–1930) [12, л. 27, 31].

У канцы 1930-х гг. палітыка ўладаў была накіравана на згортванне краязнаўчага руху як масавай грамадскай з'явы. У 1936 г. пры Акадэміі навук было ліквідава ЦБК, а у 1938 г. спынена дзейнасць усіх краязнаўчых арганізацый у БССР. А. А. Сянкевіч быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны 29 ліпеня 1938 г. У 1950-я гг. ён быў рэабілітаваны як і большасць з тых, кто прысутнічаў у пратаколе допыту.

Такім чынам дацэнт БДУ, партыйны функцыянер і навуковец А. А. Сянкевіч з'яўляўся яшчэ і актыўным удзельнікам краязнаўчых арганізацый. Ён дачыніўся да краязнаўчага руху на этапе яго станаўлення, калі фарміравалася сістэма кіраўніцтва і каардынацыі краязнаўчыімі арганізацыямі Савецкай Беларусі. У 1920-я гг. А. А. Сянкевіч уваходзіў у склад некалькіх добраахвотных арганізацый, якія актыўна займаліся краязнаўчай справай: Віцебскае акруговае краязнаўчае таварыства ў 1923–1924 гг. і Навукова-даследчае краязнаўчае таварыства БДУ (1926–1927). Ён быў членам кіруючых органаў абодвух арганізацый, прымаў удзел у працы секцый, выступаў на паседжаннях, рабіў навуковыя даклады і публікацыі. А. А. Сянкевіч прымаў удзел у Першай Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі (1924) і Другім Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе (1927), па выніках якіх былі прынятыя важныя рэзалюцыі да напрамкаў навукова-даследчай, метадычнай і ідэалагічнай працы краязнаўцаў, арганізацыйная структура сеткі краязнаўчых арганізацый БССР. А. А. Сянкевіч прадстаўляў краязнаўчы рух Савецкай Беларусі на краязнаўчым з'езде ў РСФСР і супрацоўнічаў з Цэнтральным бюро краязнаўства. У канцы 1920-х гг. ён аддаліўся ад краязнаўчай справы і засяродзіўся ў сваёй прафесійнай дзейнасці на іншых сферах. Падчас рэпрэсій другой паловы 1930-х гг. А. А. Сянкевіч быў вымушаны даць паказанні на былых калег і паплечнікаў па краязнаўчаму руху. Можна сказаць, што яго палітычная, навуковая кар'ера і жыццёвы

шлях дасягнулі свойго піку падчас станаўлення краязнаўчага руху ў БССР і былі спынены адначасова са згортваннем масавай краязнаўчай дзейнасці у канцы 1930-х гг.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Вітэль Д.* Культурнае жыццё Віцебшчыны // Савецкая Беларусь. 1924. 5 кастр. С. 3.
2. Возвращенные имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в ходе политических репрессий. Минск: Навука и тэхника, 1992.
3. *Галоўка С.* Скрыжалі лёсу Алеся Сянкевіча // Беларуская думка. 2018. № 3. С. 48–54.
4. Да Другой Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі // Савецкая Беларусь. 1926. 7 лют. С. 5.
5. Другі Усебеларускі краязнаўчы з'езд // Наш край. 1927. № 2. С. 60–62.
6. *Камароўскі А.* Хроніка аднаго жыцця // Полымя. 1973. № 4 С. 218–224.
7. *Каспяровіч М.* Краязнаўства. Мінск: Бел. дзярж. выдавецтва, 1929.
8. Краязнаўчае навукова-дасдедчае тварыства БДУ Наш край. 1927. № 8–9. С. 85–88.
9. Краязнаўчае таварыства пры БДУ // Наш Край. 1927. № 6–7 С. 111.
10. Краязнаўчая праца. Віцебск // Савецкая Беларусь. 1924. 18 ліст. С. 3.
11. Краязнаўчыя арганізацыі ў БССР // Наш Край. 1925. № 1. С. 6–10.
12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 13374.
13. НАРБ. Ф. 34. Воп. 1. Спр. 170.
14. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 300.
15. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 330.
16. Першы Усебеларускі з'езд краязнаўства // Савецкая Беларусь. 1926. 11 лют. С. 5.
17. *Пічэта У.* Краязнаўства ў Беларускім дзяржаўным універсітэце // Наш Край. 1927. № 10. С. 26–30.
18. Працы Другога Усебеларускага краязнаўчага з'езда. 10–13 лютага. / ІнБелкульт. Цэнтр. Бюро краязнаўства. Менск: Выд. Ін-та Бел. культуры, 1927.
19. Працы Першага Усебеларускага краязнаўчага з'езда. 7–11 лютага. Менск: Коштам Ін-та Бел. культуры, 1926.
20. Рэзалюцыя Першай Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі // Асвета. 1924. № 3 С. 170–171.
21. *Сянкевіч А.* Аграрны рух на Меншчыне 1905-6 // Наш край. 1925. № 1. С. 28–31.
22. *Сянкевіч А.* За ленінскую лінію ў нацыянальнай палітыцы. Мінск: Партмассектар, 1931.
23. Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя // Асвета 1924. № 3 С. 168–169.
24. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9.
25. ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 12.